*Mater Lithvaniae, ora pro nobis!*



# ЛІТВА

***ГОЛАС МАНАРХІСТА***

**№ XXIV (24)**

**МЕСЯЦ КАСТРЫЧНІК AD MMVIII (2008)**
**ГАЗЭТА ЗАСНАВАНА AD MCMVIII (1908)**
**АДНОЎЛЕНА AD MCMVC (1995)**

**РЭДАКЦЫЯ**

## ЗА ЛІТВУ!

Апошнім часам "літвінская" тэма набыла актуальнасьць у беларускай прэсе. Фактычна ніводны з апошніх нумароў часопіса "Архэ" не выходзіць без згадкі аб Літвінах. Дзеля прыкладу прывяду некаторыя зь іх: № 10/2007 артыкул "Палемічныя праекцыі Вялікага Княства Літоўскага" (А.Белы, В.Насевіч, З.Зінкявічус, А.Бацюкоў); № 12/2007 "Доўгая сьмерць славянскай Літвы" (А.Белы, А.Бацюкоў).
Таксама і "Народная Воля" надала шырокую плошчу лістам ад Літвінаў, у якіх яны тлумачаць падставы сваёй пазыцыі. Варта прывесьці вытрымкі з гэтых лістоў, каб нашы чытачы маглі адчуць жывы голас Літвінаў. 20 сьнежня 2007 г. "Народная Воля" зьмясьціла допіс Эдуарда Тобіна са Смалявічаў, які абгрунтавана тлумачыць, чаму да нашых продкаў і нашай краіны ў гісторыі належыць ужываць назву Літвіны і Літва.

***працяг на с.2***

**ДА 100-ЛЕЦЬЦЯ ГАЗЭТЫ "ЛІТВА"**

## *Крыніцы мысьлі літоўскай*

Мы вядзем свой радавод ад літоўскай газэты "Літва", што выходзіла па польску ад 1908 па 1911 гг. У гэтым годзе абыходзім 100-летні юбілей заснаваньня газэты "Літва", чаму будзе прысьвечаны шэраг артыкулаў з першаўзору, ад якога лічым сваё існаваньне. Нягледзячы на зусім розную сытуацыю цяперашняга часу і мінуўшчыны, да сёньня мы можам знайсьці шмат супольнага паміж "Літвой" таго часу і сёньняшняй. Для пацьвярджэньня прывядзем словы кн. Станіслава Радзівіла з N 13(19) "Літвы" ад 1909 году, які ў сваім "Прыкладзе для зямянства, годным дзеля насьледваньня" гаворыць "наша дактрына – гэта дабро нашай Айчыны Літвы і Беларусі, наша дактрына – гэта прызнаньне моваў і праў нацыянальных карэннага нашага насельніцтва Літвінаў і Беларусінаў, наша "дактрына" – гэта прызнаньне для нас, карэнных грамадзян Літвы і Беларусі, прыналежных праў нашай мовы і нашай рэлігіі".


LITWA

Korespondencje.

Праз 84 гады ў аднаўленай "Літве" N 1 ад 28 лютага 1995 году, у рэдакцыйным звароце чытаем: "А адзінай ідэяй, здольнай аб'яднаць значную частку нашага шматкафэсійнага і раздробленага па палітычных перакананьнях народу, можа стаць, на наш погляд, толькі Дзяржаўная ідэя. Дзеля распрацоўкі аднаго з поглядаў на яе рэалізацыю і было задумана выданьне "Літва". Чаму менавіта "Літва"? Таму што мы перакананыя: пакуль нашыя спрадвечныя назовы ня зоймуць свайго месца, пакуль жыхары сёньняшняе Рэспублікі Беларусь не ўсьвядомяць, што ў іх жылах цячэ кроў продкаў – Літвінаў – да таго часу не магчыма весьці сур'ёзную размову пра адбудову Дзяржавы. Карыстаньне назовамі, якія навязаны нам захопнікамі ёсьць працягам духоўнага рабства і маўклівою згодаю на далейшую акупацыю."

Першым артыкулам ***(гл. с. 3)***, які зьмяшчаем – гэта той, у якім гаворыцца, што Літвінам, якія гавораць нашай мовай патрэбнае асобнае выданьне. Праз сто год, ад тае просьбы Пан Бог пачуў голас свайго слугі кс. Яна Жылінскага, і нарэшце маем газэту "Літва" у гэтай мове, аб якую прасіў ксёндз.

***А.Я. Стральцоў-Карвацкі***

**ДА 100-ЛЕЦЬЦЯ ГАЗЭТЫ “ЛІТВА”**

# І ЛІТВІНАМ,
## што гавораць па беларуску трэба мець асобнае выданьне

***Пад гэтай назвай у N 48 „Viltis”-а зьмешчаны артыкул ксяндза Яна Жылінскага з Амэрыкі, які кідае новую думку, якую мы ніжэй падаём цалкам.***

“Толькі зараз удалося мне сустрэцца зь першымі нумарамі “Літвы”. Выгляд і зьмест робяць прыемнае ўражаньне. Відавочна газэце не бракуе ані матэрыялаў, ані карэспандэнтаў. Можа і не будзе бракаваць чытачоў. “Літва” выходзіць раз на два тыдні. Майма надзею, што назапасіўшы сіл пяройдзе на штотыднёвы рытм.

Ёсьць шмат Літвінаў, якія, часам не са сваёй віны, па літоўску не ўмеючы, гавораць па польску. Шмат аднак зь іх паводле духу, гэтак як і мы зьяўляюцца Літвінамі і хочуць імі быць. У “Літве” яны маюць прыгожы і карысны орган.

Шмат ёсьць таксама Беларусаў літоўскага паходжаньня. Жыцьцё і веравызнаньне зьвязвае іх больш зь Літвінамі, чым Беларусамі. Ёсьць шмат Беларусаў, якія проста называюць сябе Літвінамі і хочуць імі быць, гэтак жа, як Літвіны, што гавораць па польску. Добра было б, калі б і яны мелі свой орган у беларускай мове. У нашай Айчыне, дзе здаўна сутыкаюцца ўплывы розных нацыянальнасьцяў, людзі гавораць па рознаму. Гледзячы з аднаго боку, было б пажаданым, каб у Літве панавала адна мова, але гледзячы зь іншага боку някепска дзеіцца ў краінах, дзе пануюць некалькі моваў (напрыклад Швайцарыя). Тамтэйшым жыхарам з маленства проста навучыцца замежных моваў, што ў практычным жыцьці вельмі пажадана.


№ 8 (14) LITWA 117

Do Wilna.

Litwinom mówiącym po białorusku trzeba pisma oddzielnego

Нас, жыхароў Балцкага Памор’я, альбо балтаў, групуе і зьвязвае ня столькі мова, колькі супольная доля, патрэбы жыцьця, гэаграфічнае становішча, палітычная і эканамічная будучыня краю, урэшце гістарычныя традыцыі.

Мы ў сваёй Айчыне ня можам ствараць столькі краін, колькі ёсьць народаў, колькі моваў, але людзі, што гавораць па рознаму павінны стварыць адзін Народ. Усе Літвіны, што гавораць па беларуску гэта каталікі. Жывуць яны ў губэрні Віленскай, частцы Менскай і Гродзенскай. Вызнаваная імі каталіцкая вера паказвае, што яны прынялі хрысьціянства разам зь іншымі Літвінамі, і славянізаваліся толькі ў пазьнейшы пэрыяд. Шмат з нашых ксяндзоў віленскай і магілеўскай дыяцэзый умее размаўляць па беларуску. Як жа было б добра і карысна, калі б яны пачалі выдаваць літоўскі орган у беларускай мове.

***паводле: “Litwa”/ miesięcznik illustrowany litewski w języku polskim/ 8 (14), 1909 г.***

*працяг з с.2*

**РЭДАКЦЫЯ**

# ЗА ЛІТВУ!

Што Літвіны павінны зразумець з вышэйсказанага. Першае: трэба акрэсьліць, што мы самі разумеем пад літвінствам і кім мы сябе ўсьведамляем. Для нас літвінства – гэта адчуваньне і ўсьведамленьне пераемнасьці ад палітычных колаў ВКЛ (шляхты, духавенства, мяшчанаў) у сёньняшнім часе. Паколькі мы ня можам у гэты момант думаць аб палітычным адраджэньні нашай Айчыны, мы можам думаць як спадкаемцы аб захаваньні ўсемажлівай духовай і матэрыяльнай спадчыны, а таксама аб ператрываньні нашай ідэі да лепшых часоў, калі яна з Божай волі такое палітычнае ўвасабленьне знайсьці зможа.

Другое: мы назіраем шматгадовы ідэйны крызіс беларускасьці, на які было лякарства ў выглядзе звароту да літвінскай ідэі, што было прадэманстравана некаторымі лідэрамі беларускага руху на пачатку 90-х гг. XX ст. Менавіта тады лёзунгі аб нашай далучанасьці да спадчыны ВКЛ, у тым ліку і рэлігійнай (каталіцызм, Унія) змабілізавалі Літвінаў на падтрымку ўсебеларускага руху. Нажаль з часам вядучыя беларускія дзеячы вярнуліся да традыцыйнага ўжо да іх праслаўленьня ісьцінна беларускіх “талеранцыі”, “ціхамірнасьці”, “сялянскасьці” і т.д., у чым яны не адрозьніваюцца ад сучасных рэпрэзэнтантаў улады Рэспублікі Беларусь.

Каротка спыняючыся на тым, чаму беларуская эліта не ўспрыняла літвінства магу прывесьці адзін вельмі важны аргумэнт: з прычыны цывілізацыйнай чужасьці. Менавіта цывілізацыйная “чужына” літвінскай ідэі не дазволіла большасьці беларускіх дзеячоў яе ўспрыняць цалкам і зрабіць сваёй вядучай ідэяй. Толькі тыя, што вырасьлі, як прыкладам вядомы Зянон Пазьняк, на грунце лацінскай цывілізацыі былі здольныя гэтую ідэю зразумець і прыняць, што сьведчыць аб іх непасрэднай літвінскасьці.

З прыведзенага разважаньня для Літвінаў вынікаюць наступныя высновы. Па першае, мы мусім скарыстаць з крызісу ў беларускім руху, і заняць тую ідэйную пустку, якая ў ім запанавала. Па другое, мы павінны зразумець, што зараз паняцьці Літвін і Беларус ня зьяўляюцца тоеснымі. Беларус можа стаць Літвінам, але толькі пасьля энэргічнай працы над сабой, успрымаючы ўвесь даробак лацінскай цывілізацыі, а ня нейкую яе адарваную ад кантэксту частку, як гэта неаднакроць робяць сьвядомыя Беларусы, камбінуючы сваё мінулае, як ім хочацца. Прыняць усю нашу эліту, зь яе каталіцкасьцю, лацінскасьцю, культурнай польскасьцю. Лічыць нашымі паэтамі ня толькі Адама Міцкевіча і Францішка Багушэвіча, але таксама Вінцэнта Поля і Гэнрыка Сянкевіча. Толькі тады мы зможам зразумець ідэйны стан нашых папярэднікаў – літоўскай эліты XIX-XX стст.

***Аляксандар Я. Стральцоў-Карвацкі***

ЮБІЛЕЙ БНР

*Уладзімір Ляхоўскі:*

# ЛЕВАРАДЫКАЛЬНАЯ БНР У 1918 Г. НЯ МЕЛА ШАНЦУ

***На нашу думку цікавымі для Літвінаў могуць быць разважаньні наступных беларускіх гісторыкаў і дзеячоў-абыватэляў, зь якіх становіцца зразумела, наколькі мы Літвіны можам спадчыну гэтай рэспублікі ўспрымаць і ці гэта ўвогуле магчыма. Гэтыя кароткія інтэрвію былі ўзятыя карэспандэнтамі "Радыё Свабода" і прагучалі ў эфіры ў кастрычніку – лістападзе 2007 г. Напрыканцы зьмяшчаем камэнтар рэдакцыі. Гэтай тэмы датычыць таксама артыкул пана Скіргайлы-Палянэцкага***

***11 кастрычніка, 2007 г.***

**Шупа:** *Калі, пры якіх умовах БНР магла б сапраўды адбыцца? Што ў гісторыі мусіла павярнуцца трошкі іншым бокам? Якія былі шанцы?*

**Ляхоўскі:** У 1918 годзе беларускай эліце было вельмі цяжка дасягнуць гэтай мэты з шэрагу прычын. Падчас Першай сусьветнай вайны была зруйнаваная эканоміка. У бежанства трапіла больш за 1,5 мільёна чалавек, 400 тыс. зь іх не вярнуліся на Бацькаўшчыну. Каля 800 тыс. былі мабілізаваныя ў расейскую армію, зь іх 100 тыс. загінулі на франтах Першай сусьветнай вайны. Далей трэба зазначыць, што не сфармаваўся ўвесь палітычны спэктар беларускіх партый - дамінавалі толькі левыя радыкалы, гэта таксама паўплывала на рэалізацыю гэтай ідэі. І яшчэ - не было таго лідэра, які б мог згуртаваць вакол сябе прыхільнікаў беларускай незалежнасьці. Чытаючы цяпер лісты Доўнар-Запольскага я адразу адзначаю, што нават ён, непрафэсійны палітык, быў на галаву вышэйшы за тых маладых дзеячоў, якія стаялі ля стварэньня Беларускай Народнай Рэспублікі.



**Шупа:** *Вы растлумачылі прычыны, чаму БНР ня здолела рэалізавацца. Але ці былі наагул нейкія шанцы? Што мусіла адбыцца інакш? Калі ня ўнутраныя, дык можа зьнешнія фактары?*

**Ляхоўскі:** Я – пэсыміст. Я лічу, што адзіны шанец – гэта калі адкруціць час не да 1918 году, а да 1914-га. Калі б Мікалай II паслухаў Сталыпіна ці Дурнаво і не ўцягнуўся ў Першую сусьветную вайну. Гэта быў бы адзіны шанец – варыянт таго, пра што думаў Луцкевіч, калі б Расея эвалюцыянавала да фэдэрацыі паводле мяккага сцэнару. Тады б да сярэдзіны 1920-х гадоў Беларусь і Літва ўжо мелі б шырокую аўтаномію, мелі б свой Сойм. Далей – Першая сусьветная вайна. Калі б яе не было, не было б і Другой сусьветнай вайны, не было б Галакосту, не было б таго, што беларуская эканоміка і насельніцтва так моцна пацярпелі ад гэтых войнаў і ў між-

ДА 90-РОЧЧА БНР

# ШЛАВЯНСКАЯ РУШЧЫНА

## ці-ткі Балтыцкая Літоўшчына ў "Беларусі"

***Паўнавартасныя народы шануюць свае ды чужыя вартасьці, непаўнавартасныя – вычвараюць іх.***

"Беларусь" а "Беларусы" заўжды трывацьмуць карыкатураю на існыя інкарнацыі ВКЛ а Рэчы Паспалітай абыдвох народаў: на Летуву й Польшчу, але ў горшае ступені на Летуву. Нават калі Беларусь станеся сябраю NATO і EU ці прынамся здабудзе ся на стасоўную Незалежнасьць перад кацапіяй а пачне дбаці на самаістасьць – трывацьме гэткай карыкатураю, паўстаўшы бо на вынік інсынуацыяў а ідэёвых вычвараньняў на кшталт існаваньня "славянаў", праваслаўнага зьвіху а западнорусізму пасполя зь імі. Маючы балтыцкія ґэны а шляхоцкую спадчыну з даўнай гісторыйі, але зь візанцкай атрутаю ў глуздох, Беларусі наканавана быці Цмаком із адцятым голавам а ўклібленым заміж яго голавам малпы.

Хлусьня спараджае хлусьню: злудні а мікры інсьпіраваных крыўдаў вярэдзіцьмуць сьведамасьць Беларусоў бухторачы іх да адпомніцы Летувіном з Палякамі як "суседзям-злодзеям", якія "узурпаваўшы" гістарычных тэрыторыяў, асобаў а вартасьцяў: Беларус заўжды будзя напарнікам, які хавае пад коўдрай сякеру.

Каб унікнуць няўтульнасьці, якая трывацьме на лязе й абушку гэтай сякеры, трэ дапамагчы "Беларусом" павяртаці сабе ўсьведамленьня ся ў свае ґэнэтычные самаістасьці: імя (імёнаў), цывілізацыйна культуровых спакмеўнікаў (арентыраў), скарэгаваці самаўканаваньня – самаўсьведамленьня ся пераз уканаваньне самаістасьці. Натуралёва, учыніці гэта трэ па за штыўнасьцяй а начэплівасьцяй: рукома а розумам самых-ткі "Беларусоў", якія ўжо эвалюцыянаваўшы, пераз пошук самаістасьці на Крывічоў а Ліцьвіноў – Балтаў. Перакшталтаваці "Беларусоў" спросту на Летувіноў ці Палякоў выгражае паўстаньнем шчэ горшых шаржаў, якія расчыняцімуць атруту павярхоўнасьці і прымітыўнасьці ў сапраўдных Палякох ці Летувінох ад іхнага-



ткі імя! Наноўкшталтаваньне Нацыі ёсьць справаю грунтоўнага распаўсюду адукацыі, прыкладам праз падмоставыя навучальныя ўстановы на кшталт Літоўскага Калегіюму. Ужыцьцяўленьне гэткіх канцэптаў вымагае не тыкеля сталага фундаваньня, але й усталюнку грамадзянства ВКЛ а Рэчы Паспалітай абыдвох народаў, якое ўсталюе бязьвізавы рух а абарону правоў як грамадзянаў роўнаж Летувы й РП дзеля Літвіноў-Крывічоў у "Беларусі", якія распаўсюджваюць Балтыцкую Сьведамасьць пераз гэткія інстытуцыйі ці паасобна.

***Пан Ськіргайла Палянэцкі-Мацкевіч (правапіс аўтара захаваны)***

ваенны час. Тады да пачатку 30-х была б праведзеная беларусізацыя, сфармавалася б новая палітычная эліта і нашчадкі Івана і Лук'яна Саланевічаў ужо б размаўлялі пабеларуску і не вызнавалі б тых поглядаў, якія вызнавалі гэтыя дзеячы.

***Шупа*:** *Якія сюжэты з гісторыі найбольш Вас захапілі? Што магло б стацца асновай літаратурных твораў?*

***Ляхоўскі:*** Мяне цікавіць постаць Рамана Скірмунта. Калі ён меў магчымасьць узначаліць кабінэт міністраў – у яго была вельмі прагматычная праграма – і ў сельскай гаспадарцы, і ў адукацыі. Думаю, што гэтая асоба заслугоўвае вялікай увагі.



***Беларускі гісторык зь Беластоку – Алег Латышонак***

***22 лістапада 2007 г.***

***Шупа:*** *Наколькі рэальна было ў 1918 годзе, калі б нейкія палітычныя падзеі павярнуліся б трошкі інačай – які быў шанец захаваць БНР?*

***Латышонак:*** Шанец, думаю, быў – ніколі не бывае, каб гістарычныя падзеі былі неяк ужо акрэсьленыя загадзя. Я ўсё-ткі лічу, што ёсьць вялікая доля выпадковасьці, вялікая доля магчымасьцяў, якія стаяць перад чалавекам, які вырашае, і такім чынам БНР магла збыцца, я разважаньняў на гэтую тэму не адкідаю.

***Шупа:*** Калі б Вы былі пісьменьнікам і перад Вамі стаяла задача напісаць такі ўтапічны твор – што б Вы тады зьмянілі ў хадзе гісторыі, каб яна магла пераключыцца на такія рэйкі?

***Латышонак:*** Тут не было такіх выпадковых здарэньняў... Думаю, што калі б былі іншыя людзі, не сацыялісты, то было б больш шанцаў на тое, каб стварыць дзяржаву. Для мяне было ясна, што гэтыя людзі не нацыяналісты і не дзяржаўнікі, калі яны вышэй ставілі сацыяльную рэвалюцыю, прычым невядома, ад імя каго яны гаварылі, таму што народ быў большасьцю кансэрватыўны і манархічны.

**Алег Латышонак:**

***Калі б былі іншыя людзі, не сацыялісты, то было б больш шанцаў на тое, каб стварыць дзяржаву. Для мяне было ясна, што гэтыя людзі не нацыяналісты і не дзяржаўнікі, калі яны вышэй ставілі сацыяльную рэвалюцыю, прычым невядома, ад імя каго яны гаварылі, таму што народ быў большасьцю кансэрватыўны і манархічны.***

***Шупа:*** *Яны, можа, думалі інačай, усё ж такі асноўная маса насельніцтва былі сяляне, а эсэры, якія панавалі ў БНР-аўскіх колах, абапіраліся якраз на сялянства...*

***Латышонак:*** Але на прыдуманае расейцамі сялянства, а не на беларускае. Яны абапіраліся на ідэю сялянства, якую мелі расейскія нарадавольцы. Усе гэтыя ідэі Беларускай Сацыялістычнай Грамады яшчэ да першай усясьветнай вайны – гэта жах! Забраць у людзей зямлю, пасьля даваць яе ў арэнду, ніякай прыватнай маёмасьці – гэта кашмар, да ніякага беларускага селяніна з такой праграмай ня можна было ісьці...

БНР у ідэальных межах, як іх уяўлялі сабе беларускія палітыкі ў 1918-1919 гг., зь Беластокам, Вільняй і Смаленскам, была б вельмі моцнай дзяржавай. Гэтая дзяржава мела б нейкія напружаньні з суседзямі, але думаю, што за такі пэрыяд у Вільні цяпер бы ўзьнік літоўскі ўнівэрсытэт, у Горадні, можа, польскі... Не было б, безумоўна, Другой усясьветнай вайны, у Эўропе не было б такой палітычнай канфігурацыі, якая дазволіла б агрэсію каму-небудзь на Захад ці на Ўсход, калі б нават на Ўсходзе быў камуністычны Савецкі Саюз. Думаю, што БНР выглядала б як сярэдняя цэнтральнаэўрапейская дзяржава.

## *Да Юбілею Беларускай Народнай Рэспублікі*

**КАМЭНТАР РЭДАКЦЫІ**

Нарэшце прыйшоў час "зьбіраць камяні". Раскідвалі, раскідвалі ўсё XX стагодзьдзе, ажно ў канцы прызналіся: "ня было шанцу". Лепш позна, чым ніколі! Для нас Літвінаў гэтыя разважаньні маюць вялікае значэньне. Абрынуўся міф аб тым, што дзяржаву можна ўтварыць выключна на сялянскім субстраце. Часта прыводзяць такі прыклад – маўляў і Чэхі і Літоўцы (сучасныя балты) – таксама сялянскія нацыі, забываючы, што рухавіком Чэхіі стала дробная буржуазія, што выйшла яшчэ з Аўстра-Вугорскай манархіі, а сярод першага Сойму – Тарыбы Літоўскай Рэспублікі адну трацiну дэлегатаў складалі ксяндзы.

Можа найлепшы час, каб пачаць нарэшце гэтую будучую эліту выхоўваць, калі ўжо ўладу зараз узяць ня можам? "Узяць" – гэта значыць несьці адказнасьць за тое, што мы гаворым і за прынятыя рашэньні. Праўда ёсьць яшчэ выбар перад кім гэтую адказнасьць несьці – перад Богам і гісторыяй, ці перад "электаратам"? Нажаль на такі выбар палітыкі апазыцыйнага кола, за выключэньнем Зянона Пазьняка, няздольныя.

ВЫСНОВЫ: Літвіны ня могуць успрымаць спадчыну БНР як добрую ў культурным пляне. Гэта немагчыма з-за радыкальнага сацыялізму "айцоў" БНР і як выніку шкодных канцэпцыяў у галіне права прыватнай уласнасьці, адносінаў да рэлігіі і асабліва Рэлігіі Каталіцкай.

Літвіны могуць успрымаць жаданьне асобных тагачасных абыватэляў Краю здабыць дзякуючы БНР палітычную незалежнасьць гэтых земляў ад Расеі і такім шляхам жаданьне рукамі сацыялістаў выратавацца ад яшчэ больш д'ябальскай і радыкальнай камуністычнай – бальшавіцкай навалы. Гісторыя і досьвед нашага народу аднак паказалі, што ў гэтым сэнсе нашмат больш трывалымі і абароназдольнымі аказаліся дзяржавы Палякаў і балтыйскіх нацыяў, якія дзякуючы дакладнаму – несацыялістычнаму і антыкамуністычнаму культурнаму коду, набытаму за шмат вякоў самавыхаваньня – здолелі ўзьняць большую частку сваіх грамадзтваў на сьвятую барацьбу з камунізмам.

БНР ня здолела выканаць сваёй місіі па дзьвюх галоўных прычынах. Першая – ідэалягічная – сацыялізм і камунізм разглядаліся масамі нашага насельніцтва як рухі ідэйна блізкія, таму для ворагаў гэтых ідэяў, яны былі абедзьве неўспрымальныя, для прыхільнікаў жа нашмат больш трывалым падаваўся лад прапанаваны Савецкай Расеяй.

Другая – праблема культурнага коду. Беларуская паводле духу і літары дзяржаўнасьць можа быць утворана выключна на візантыйскім грунце, што пацьвярджае гісторыя. Спробы "вэстэрнізаваць" – "азаходніць" беларускую ідэю і рэчаіснасьць заўжды прыводзілі да фіяска. Адзіным шляхам вэстэрнізацыі для нашага Краю зьяўляецца паступовая культурная асіміляцыя беларускіх масаў Літвінамі. Такая асіміляцыя толькі тады будзе пасьпяховай, калі Літвіны – нэафіты адназначна прадэкляруюць сваю прыналежнасьць да Каталіцкай Царквы. Бо рэлігійны фактар пры цывілізацыйнай самаідэнтыфікацыі мае вырашальнае значэньне.

**ГІСТОРЫЯ ЭКАНОМІКІ**

***У сярэдзіне XVIII ст. Рэч Паспалітая нажаль ўяўляла сабой спустошаны край, дзе ў палітыцы і эканоміцы панавала анархія і бязладдзе. Хоць у апошнія гады каралявання Аўгуста III (1733-1763) у дзяржаве адбылося супакаенне, але сапраўдныя рэформы распачаліся толькі з пачаткам каралявання Станіслава Аўгуста Панятоўскага (1764-1795). Менаваіта за часы гэтага караля ўрад пачаў праводзіць пратэкцыянісцкую палітыку ў адносінах да імпартных тавараў і актыўна пачаў удзельнічаць у стварэнні ўласнай прамысловасці, шматлікіх рамёстваў і мануфактур.***

Горадня. Прадмесьце Гарадніца. Малюнак 1789 г.



# КАРАЛЕЎСКІЯ ЭКАНОМІІ
## *Вялікага Княства Літоўскага*

Мануфактуры ў Еўропе XVIII ст. былі адным з галоўных элементаў развіцця прамысловасці. Па форме ўласнасці і прыналежнасці капіталу да іх стварэння яны разніліся на: гарадскія, якія паўставалі з цэхавых рамёстваў, прыватнаўласніцкія, якія стваралісся на падворках буйных феадалаў і дзяржаўныя, якія паўставалі на абшарах каралеўскіх каномій.

Трэба прызнаць, што дадзеная сістэма градацыі з'яўляецца для Еўропы толькі як умоўны прыклад першапачатковага развіцця мануфактур, бо такім чынам яны толькі пачалі ўзнікаць, але ва ўмовах эканамічнага росту і шчыльнай канкурэнцыі мусілі паміж сабой аб'ядноўвацца і ў далейшым функцыянаваць як прыватныя прадпрыемствы выключна на капіталістычных рэйках, дзе валадар быў прафесійным капіталістам, ставячым мэтай сваёй дзейнасці атрыманне прыбытку і выцясненне з унутранага рынку сваіх канкурэнтаў шляхам іх банкруцтва. Пры гэтым былыя цэхавыя майстры пераробляліся ў вольнанаёмных рабочых, якія працавалі выключна за грошы і ня мелі ад гэтага прадпрыемства ніякай уласнасці. Чым больш банкрутавала дробных прадпрыемстваў, тым больш насычаным рабіўся рынак рабочай сілы.

Існаваў і другі прыклад развіцця мануфактур – гэта стварэнне акцыянерных таварыстваў, яны стваралісся шляхам аб'яднання дробных прадпрыемстваў існаваўшых да гэтага на феадальных ці паўфеадальных пачатках, с запрашэннем да ўдзелу капіталу. Колькасць акцый размяркоўвалася прапарцыйна колькасці ўкладзеных у прадпрыемства грошаў. Такі паўкапіталістычны лад развіцця прамысловасці Усходняй Еўропы быў характэрны амаль да сярэдзіны XIX ст., а ў XVIII ст. адбываўся пераход ад феадалізму да капіталізму.

У Рэчы Паспалітай і асабліва на беларускіх землях сітуацыя істотна адрознівалася. На працягу XVIII ст. эканоміка развівалася выключна на феадальнай аснове, рынак рабочай сілы цалкам залежаў ад магчымасцяў феадала вызваліць ад сельскай гаспадаркі пэўную колькасць сялян і далучыць іх да сваёй прамысловай гаспадаркі, у большасці выпадкаў рамеснай. Рамесніцтва ў асноўным існавала ў феадальных маёнтках шляхты і задавальняла іх патрэбы, пры гэтым крыніцай для развіцця гаспадаркі заставалася аграрная праца сялян. Прамысловая вытворчасць была на пачатку стратнай і пачала развівацца дзеля задавальнення ўнутраных патрэб маёнтка ў гаспадарчых вырабах, дзеля таго каб не плаціць за такія ж вырабы суседняму феадалу. У гарадах рамесніцтва развівалася ў межах яўрэйскіх кагалаў і існавала ў асноўным для задавальнення патрэб мяшчанаў.

Найбольш развітай формай прамысловасці на тэрыторыі Беларусі XVIII ст. была прамысловая кампанія каралеўскіх мануфактур створаная на тэрыторыі Гродзенскай эканоміі, з уключэннем прадпрыемстваў Брэсцкай і Шавельскай (сёньня – Шяўляй, ЛітРэсп) эканомій, намаганнямі падскарбія графа Антонія Тызенгаўза. Каралеўскія эканоміі былі створаны ў 1589 г. з маёнткаў, даходы з якіх ішлі на ўтрыманне каралеўскага двара. Так напрыклад, паводле інвентара 1783 г. Гродзенская эканомія падзялялася на 5 губерняў: Азёрская, Дамброўская, Квасаўская, Крынкаўская, Сакольская, Янаўская. У іх склад уваходзіла 49 ключоў, 24 фальваркі, 1 лентвойтаўства, 13 гарадоў і мястэчак, 368 вёсак – усяго 7 294 валокі зямлі, 10 580 гаспадарак, насельніцтва 42 380 чалавек. У эканоміі ляжала 5 пушчаў: Белавежская, Лужыцка-Аліцкая, Перстунска-Пераломская, Сакольска-Новагародская, Стрыеўска-Берштаўская.

У сярэдзіне XVIII ст. надворным падскарбіем Літоўскім быў прызначаны граф Антоній Тызенгаўз, які ў хуткім часе распачаў комплекс рэформ каралеўскіх каномій. У стварэнні мануфактур у Гродзенскай каралеўскай эканоміі граф А. Тызенгаўз прыняў найбольш дзейны ўдзел. Да гэтага ён меў досвед у гэтай справе праз створаную ў Польшчы "Кампанію ваўняных мануфактур", пры гэтым яго імя фігуруе на чацвёртым месцы. А яшчэ раней ён тое самае рабіў у сваім маёнтку Паставы (Ашмянскага павета), пабудаваўшы тут мануфактуру. Кароль Польскі і Вялікі Князь Літоўскі Станіслаў Аўгуст Панятоўскі прывілеем ад 27 кастрычніка 1777 г. загадаў наступнае: "Перадаём Нашыя мануфактуры пад адказнасць і клопат падскарбія, дазваляем яму дзеля гэтых мэтаў наймаць майстроў, разам з гэтым прадстаўляем яму поўную свабоду ўнутранага кіравання і гандлю ... вызваляем некаторыя Нашыя мануфактуры ад мытных падаткаў размешчаныя ў Вялікім Княстве Літоўскім".

На 1 ліпеня 1771 г. пералік дзейнічаючых мануфактур складаўся з: "залатой", шаўковай, сукнянай, камлотнай, панчошнай, палатнянай, фарбарні, ільняной, фарботнай, капялюшнай, карэтнай, картачнай, булавак і іголак, зброі, напільнікаў, сталёвых прылад, выраб з жалезнай медзі, бялільні

воску, скураной, жалезных руд ў Брэсце і палатнянай ў Шаўлях.

У самым Гродне існавалі толькі мануфактуры па вытворчасці карт і зброі, астатнія размясціліся ў прадмесці Гарадніца. Новы прамысловы цэнтр Гарадніца быў выбраны вельмі трапна, як раз пры ўпадзенні ракі Ласосны ў Нёман. Берагі Ласосны былі ўмацаваныя, русла было скіравана так каб магло служыць дзеля патрэб прамысловасці. Прамысловыя пабудовы падскарбій загадаў рабіць з бутавага камення, а жылыя памяшканні – з цэглы. У 1777 г. сюды былі перавезены вытворчасці па вырабу воску, бялільня палатна, скураных вырабаў і шляп. Праз два гады былі падрыхтаваны памяшканні пад суконную мануфактуру, залатую, шаўковую, палатняную і кухню.

На каралеўскіх мануфактурах працавалі розныя людзі. Вольнанаёмныя майстры па кантракце і рабочыя (былые сяляне). З першай катэгорыяй асоб заключаліся доўгатэрміновыя кантракты на нявызначаны час, згодна з якімі майстр працаваў 6 дзён у тыдзень па 13.30 гадзін, што амаль супадала з рабочым часам "Кампаніі ваўняных мануфактур" і працяглacцю прац у краінах Заходняй Еўропы XVIII ст.

Згодна дамове майстр абавязваўся выконваць усе віды патрабуемых ад яго работ за годную аплату: "Пан Лаўр'е абавязваецца служыць скарбу ўсімі сваімі якасцямі, за што будзе атрымліваць 1440 злотых Рэчы Паспалітай у год, кватэру, дровы, свечы і харч дзеля сябе і сваёй сям'і".

Згодна дамове ад майстроў патрабавалася бязплатнае навучанне вучняў свайму майстэрству. Пры гэтым падмайстры за працу грошаў не атрымлівалі, а толькі харч і вопратку на сваё ўтрыманне. У асноўным майстры атрымлівалі па 800 – 900 злотых у год, пры гэтым дастаткова значная частка майстраў атрымлівала ўсяго толькі 200 – 250 злотых у год.

Найболш аплачвалася праца дырэктараў мануфактур і іншых кіраўнікоў. Так напрыклад Ян Людвік Інард зарабляў 3600 злотых у год, што па словах самога Тызенгаўза прыраўнівалася да заробку высакапастаўленых ураднікаў Прускага каралеўства, а на тэрыторыі Рэчы Паспалітай такі прыбытак можна было атрымліваць толькі пры валоданні маёмасцю ў 100 000 злотых. У асноўным дырэктары атрымлівалі 1000 – 2000 злотых у год.

Такія высокія заробкі граф А. Тызенгаўз мог выплачваць майстрам і дырэктарам толькі дзякуючы падтрымцы дзяржаўнага скарбу на працягу шэрагу год. Пры гэтым усе архіўныя крыніцы і аўтары манаграфій прысвечаныя гэтай тэматыцы сцвярджаюць, што ў касах прадпрыемстваў ніколі не хапала грошаў дзеля набыцця сыравіны, з-за чаго прадпрыемствы часта не працавалі, але сума жалаванняў вышэй азначаным катэгорыям мануфактурных дзеячоў не змянялася.

У найгоршай сітуацыі заставаліся вучні. На утрыманне аднаго вучня ў тыдзень выдзялялася 4 злотых, на вопратку 60 злотых у год, што ўсё разам складала 268 злотых у год. У той час як на ўтрыманне вучня медычнай школы выдзялялася 400 – 500 злотых у год і гэтага было далёка не дастаткова. Пры гэтым нельга казаць, што адміністрацыя нічога дзеля вучняў не рабіла. Перад усім, назірала за іх маральнасцю і, таму, былі ўсталяваныя асобныя палаты гульняў і сну дзеля кожнага полу, таксама хлопчыкі і дзяўчынкі па асобку працавалі і вучыліся. Пры мануфактурах працавала нядзельная школа. Заняткі працягваліся з 9 гадзін да 11 і з 13 да 17 гадзін, прычым нават у святочныя дні. Вучняў вучылі маляваць (2 гадзіны), пісаць (2 гадзіны), арыфметыцы (1 гадзіна) і чытанню (1 гадзіна). Маляванню вучылі ў асноўным майстры, а час ад часу і лепшыя вучні, пісанню і арыфметыцы – чыноўнікі з канцэлярыі.

***Згодна дамове майстр абавязваўся выконваць усе віды патрабуемых ад яго работ за годную аплату: "Пан Лаўр'е абавязваецца служыць скарбу ўсімі сваімі якасцямі, за што будзе атрымліваць 1440 злотых Рэчы Паспалітай у год, кватэру, дровы, свечы і харч дзеля сябе і сваёй сям'і".***

Тэхніка вытворчасці на Гродзенскіх мануфактурах нічым не адрознівалася ад тэхнікі, што выкарыстоўвалася ў краінах Заходняй Еўропы. Такая акалічнасць абумоўлівалася асобнымі пунктамі дамовы з майстрамі, згодна з якой майстры абавязваліся ці самастойна вырабляць неабходнае ў мануфактуры абсталяванне, ці прывозіць з сабой. Адзін з пунктаў дамовы з майстрам Даніэлем Віллі сцвярджаў: "я бяру на сябе абавязак абсталявання ільняной і бавоўнянай мануфактур ... дзеля чаго я перад усім павінен, азнаёміцца з канструкцыяй лепшых вытворчых прылад, вырабляемых па швейцарскаму ўзору скарбавымі рамеснікамі і са скарбавага матэрыялу і дабраахвотна сачыць за іх усталёўкай. З другога баку падскарбій сам прыкладаў усе намаганні каб каралеўскія мануфактуры былі забяспечаны найлепшымі сродкамі вытворчасці. Дзеля гэтага з 15 красавіка па 10 кастрычніка 1772 г., упаўнаважаная асоба раз'язджала па Англіі і аглядала мануфактуры ў найбуйнейшых прамысловых цэнтрах: Манчэсцер, Ліверпуль, Бірмінгем, Шэффілд, Дэрбі, Глостэр і іншыя. Пасля сваёй вандроўкі ўпаўнаважаная асоба склала справаздачу на французскай мове аб бачаных ёю 40 цудоўнейшых машынах. У дадатак трэба адзначыць, што майстры выпісваліся з тых частак Еўропы, дзе дадзенная справа была арганізавана найлепшым чынам. Але ў Гродне, як і ва ўсёй Еўропе, колькасць машын была мізэрнай і асноўная праца па ранейшаму выконвалася ручным спосабам.

Для збыту прамысловых вырабаў падскарбій адкрыў у Гродне, Паставах і Быцені лаўкі шоўкавых тавараў, а ў 1776 г. граф А. Тызенгаўз заснаваў у Гродна камерцыйную кантору, у якой тавары можна было набываць у крэдыт як дзеля айчыннага спажыўца, так і дзеля вывазу асобнымі купцамі тавараў на продаж за мяжу, найперш на Лейпцыгскую ярмарку, Франкфурт і Кёнігсберг.

Пачатак канца каралеўскіх мануфактур адносіцца да 1780 г., калі не хапіла грошаў па выплатам запазычанасцяў па галандскаму займу ад 1776 г. на суму ў 9 000 000 злотых. Пазыка была аформлена на ўмовах, калі што год не будзе выплачвацца сума ў 900 000 злотых і працэнты, тады крэдыторы атрымліваюць права ўзяць літоўскія эканоміі ў сваё валоданне да канчатковага пагашэння запазычанасці. У 1780 г. грошаў не хапіла і граф. А. Тызенгаўз быў вызвалены ад пасады падскарбія. На паседжаннях сейма 1780, 82 і 84 гг. былога падскарбія абвінавацілі ў злоўжываннях. Толькі заступніцтва караля вызваліла графа ад судовых абвінавачванняў. У выніку былы падскарбій захварэў і ў 1785 г. памёр, а разам з яго смерцю прыйшлі ў заняпад і мануфактуры. Паводле сведчанняў некаторыя мануфактуры працягвалі існаваць да 1794 г., калі яны працавалі на патрэбы паўстанцаў Тадэвуша Касцюшкі.

Розныя гісторыкі і сучаснікі той эпохі розна разглядаюць прычыны заняпаду Гродзенскіх каралеўскіх мануфактур. Гіпотэзы пачынаючца ад простай зайздрасці сучаснікаў падскарбія да яго неабсяжнай улады і вялікаму сяброўскаму даверу караля і заканчваючы некампетэнтнасцю самога падскарбія ў эканамічных пытаннях, пэўнага самадурства графа ў прыняцці рашэнняў. Але трэба звярнуць увагу і яшчэ на адну акалічнасць, фінал кар'еры графа А. Тызенгаўза, фінал каралеўскіх мануфактур і фінал Рэчы Паспалітай адзін і той жа.

*Аляксандар Хромы*
*(правапіс аўтара захаваны)*



# ДЗІКАЕ ПАЛЯВАНЬНЕ Ўладзімера Караткевіча

***Цікавае разважаньне знайшлося на жывым дзёньніку http://tulyaha.livejournal.com. Пан Туляга думае аб знанай кнізе, аднаго з “апосталаў” беларускай ідэі савецкага часу, Уладзімера Караткевічы “Дзікае паляваньне караля Стаха”.***

У кнізе Караткевіча ўзброены коннік – гэта зло. Колішні абаронца пераўтварыўся ў фантомную пачвару, якая ў хаўрусе з іншымі, пераследуе і забівае людзей. Якія таямнічыя і непрадказальныя мутацыі да гэтага прывялі?

“У той час якраз падыходзіў да канца доўгі і балючы працэс вымірання нашай шляхты, – спрабуе даць адказ Караткевіч. – Гэта было паміранне байбакоў, якія занурыліся ў свае норы, паміранне жабракоў, продкі якіх былі адмечаны ў Гарадзельскім прывілеі, а самі яны, хоць і жылі ў багатых, напаўразбураных палацах, насілі ледзь не кажухі, хоць гонар іх быў нязмерны.

Гэта было адзічанне без прасвятлення: брыдкія, часам крывавыя ўчынкі, прычыну якіх можна было шукаць толькі на дне іх, блізка або занадта далёка адзін ад аднаго пасаджаных вачэй, вачэй вылюдкаў, дэгенератаў.”

Вычварныя колеры, гратэск, непрыязнасць да шляхты…

І справа не толькі ў гатычным жанры, для якога “дэгенерацтва”, праклёны і “выраджэнне” – абавязковы асартымент.

Чаму пісьменнік ухваліў шляхціца Загорскага, які змагаўся за вызваленне сялян у “Каласах пад сярпом тваім” – і жорстка абышоўся з героямі “Дзікага палявання”?

І хіба Эдвард Вайніловіч, Магдалена Радзівіл, Раман Скірмунт, якія жылі ўжо ў XX стагоддзі – не ёсць беларуская шляхта? Годная сваіх продкаў?

Няўжо Караткевіч не ведаў гэтага? Ведаў. Але пісьменнік быў натхнёным прапаведнікам адраджэнскай ідэі, якая патрабавала зусім іншага адказу – і іншых сюжэтаў.

Дзеянне ў аповесці невыпадкова прыпадае на 80-ыя гады XIX стагоддзя. Менавіта ў гэты час пачаўся разбор духоўнай спадчыны Рэчы Паспалітай. Украіна прыглядалася да казацтва, Літва цягнулася да паганства і каралёў, Польшча абірала шляхецтва, а Беларусь, як вясковая ідыётка, з радасцю накінулася на каўтун, лапці і гнілую хатку.

Калі польскае грамадства на чале з Генрыхам Сянкевічам шукала ў мінулай велічы натхненне і ўзоры для пераймання, то беларуская шляхта, зачараваная небяспечнымі ўтопіямі прышлага, пнулася ў гурткі народнікаў і марксістаў і, як персанаж аповесці Свеціловіч – марыла выпусціць з уласных жылаў рэшткі шляхецкай крыві.

Гэта быў фатальны выбар – і шлях у нікуды. Неўзабаве шляхціц Багушэвіч прыкінецца Мацеем Бурачком, “дурным мужыком, як варона”, а шляхціц Луцэвіч – Янка Купала – абвесціць сябе галодным і “цёмным” “панам сахі і касы”.

У Купалаўскай “Бандароўне” ёсць сцэна пагоні, калі няшчасную гераіню пераследуюць узброеныя вершнікі злога пана. (Сам Купала, дарэчы, таксама быў панам, толькі збяднелым!) “Наляцела, адшукала дзікая пагоня, – палохае пясняр. – Ночка цёмная глядзела ды цямнейша стала, адна зорка мігацела – і тая прапала.”

І менавіта такая зорка будзе зіхцець над дзікім паляваннем “мужыцкага” караля Стаха, “самотная, вострая, як іголка”. І нат у гарадскога Максіма Багдановіча, які не меў сталай звычкі паціраць цыбуляю вочы, каб выць над жабрачай доляю, гучаць небяспечныя ноты. У ягонай кананічнай “Пагоні” (якую нат прапаноўвалі на дзяржаўны гімн!) ёсьць схаладнелая недагаворанасць, зляканая і вусцішная затрымка.

“Бійце ў сэрца іх – бійце мячамі! Не давайце чужынцамі быць! – заклікае паэт вершнікаў-мсціўцаў. І захліпваецца, звяртаючыся да Радзімы. – Ты прабач. Ты прымі свайго сына”…

Прабачыць – за што? За здраду?...

Шляхта здрадзіла “Пагоні”.

Яна не здольная выбавіць “забраны край” ад няправільнай – акупацыйнай – улады. Але ёсць народ, хавальнік праўды і забабонаў – і ёсць інтэлігент (пачасту колішні шляхціц), які правільна прачытвае старажытныя легенды і міфы і дамагаецца вызвалення.

На гэтай схеме трымаецца ўсё беларускае Адраджэнне. І ягоныя кананічныя сюжэты, першы з якіх – аповесць Уладзіміра Караткевіча...

ЛІТВА Газэта «ЛІТВА». Адноўлена ў 1995 г. Рэдактар: Аляксандар Я. Стральцоў-Карвацкі Для допісаў: п/с 26, 220050 Меньск-Літоўскі Рэч Паспалітая Літва – Res Publica Lithvania e-mail: pol_lit@interia.pl